*А. І. Бабко,*
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# НАВУКА ЯК ДУХОЎНЫ ФЕНОМЕН

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэарэтычны аналіз навукі як духоўнага з'явішча сутыкаецца з цяжкасцямі, звязанымі найперш з наяўнасцю ў гісторыі культуры розных інтэрпрэтацый феномена духоўнасці, розных падыходаў да вызначэння адпаведнага паняцця (у тым ліку і нігілістычна-натуралістычных ці скептычных). У самым агульным і абстрактным плане неабходна вылучыць у першую чаргу дзве вызначальныя для даследаванняў, што вядуцца ў дадзеным кірунку, канцэптуальныя стратэгіі: па-першае, аксіялагічна афарбаваны падыход (у такім выпадку духоўнасць разглядаецца ў сувязі з найвышэйшымі патрэбамі і памкненнямі чалавека і чалавецтва); па-другое, аксіялагічна (адносна) нейтральны (згодна з ім духоўнае выступае як сфера, дзе так або інакш, у той ці іншай ступені трансцэндуецца і трансфармуецца прыродны, біялагічны пачатак – відавочна, што ён не з'яўляецца абсалютна нейтральным, бо ў яго рамках духоўнае ўсталёўваецца над біялагічным). Падобны падыход здзяйсняецца, напрыклад, у гегелеўскай філасофіі (дзе таксама захоўвае аксіялагічнае адценне: Гегель разглядае дух ва ўсіх яго праявах як сферу ўвасаблення абсалютнай ідэі, значна больш высокую, чым прыродная).

У дадзенай сувязі надзвычай важна, што ступень транцэндавання і трансфармавання біялагічнага, вітальнага ў духоўным можа быць рознай, адкуль вынікае, што яно мае іерархічную будову. Дадзены момант зноў-такі выразна артыкулюецца Гегелем, які даводзіць, што дух выступае найперш як абцяжараны прыроднасцю, якая знімаецца праз яго інтэнсіўную працу. Найвышэйшы яе вынік – дасягненне ўзроўню абсалютнай духоўнасці, узроўню мастацтва, рэлігіі і філасофіі.

Неабходна адзначыць, што пры вызначэнні духоўнага патэнцыялу навукі істотныя праблемы паўстаюць і ў сувязі з яе ўласнай складанай, неадназначнай існасцю. Наяўнасць у навуковым пазнанні моцнага прагматычнага аспекту ставіць пад пытанне паўнавартасны яго характар як духоўнай формы ў кантэксце першага з адзначаных вышэй (аксіялагічнага) падыходу і стварае

ўражанне няпэўнасці яго месца ў іерархіі духоўных феноменаў у рамках другога (аксіялагічна нейтральнага).

Уяўленне пра амбівалентны характар навукі ў каштоўнасным плане і пра яе недастаткова акрэслены статус у сістэме духоўных формаў грунтуецца, такім чынам, на тым, што, з аднаго боку, яна выступае як пэўны спосаб пазнання свету (і таму павінна разглядацца ў кантэксце памкнення чалавека і чалавецтва да высокага ідэалу праўды), а з іншага, – як падкрэслена вышэй, ёй уласціва істотнае прагматычнае вымярэнне (і разам з ім грунтоўная сувязь са сферай першасных, вітальных чалавечых патрэбаў). Акрамя таго, каб эфектыўна выконваць сваю прагматычную функцыю, навука не павінна надта далёка адыходзіць ад пачуццёвага досведу і вытворчай практыкі, пакліканых пільна кантраляваць яе тэарэтычныя пабудовы. Разам з тым, аднак, згаданы кантроль не можа і не павінен быць занадта жорсткім: тэарэтычны ўзровень навукова-даследчай дзейнасці захоўвае адносную самастойнасць у яе рамках і актыўна ўплывае на эмпірычна-практычны яе складнік.

У дадзенай сувязі варта адзначыць, што ўяўленне пра навуку як адмысловы спосаб дасягнення праўдзівых ведаў не з’яўляецца агульнапрынятым. У якасці прыкладу скептычнага стаўлення да яго можна прывесці погляды Т. Куна, які энергічна падкрэслівае «антытэлеалагічны» характар гістарычнага разгортвання навуковага пазнання і таму катэгарычна адмаўляе наяўнасць навуковай праўды як яго нязменнай мэты, да якой яно няўхільна набліжаецца [3, с. 172–173]. Тым не менш і ў рамках падобнага кшталту філасофскіх канцэпцый дапускаюцца своеасаблівыя скептычныя аналагі праўды (у Т. Куна, напрыклад, гэта – ступень прыстасаванасці навуковай тэорыі да пэўных культурна-гістарычных умоў, яе адпаведная канкурэнтаздольнасць), што яскрава сведчыць пра неабходнасць ідэальных рэгулятываў навуковага пошуку, узнятых над яе прагматычным аспектам.

Калі неадназначную, складаную натуру навукі разглядаць у кантэксце яе гістарычнай дынамікі, дык найперш можа ўзнікнуць уражанне, быццам гісторыя разгортвання навуковага пазнання выяўляе ў канчатковым выніку тэндэнцыю да ўзмацнення пазіцый менавіта прагматычнага боку. Узнікненне навукі сучаснага тыпу ў выніку навуковай рэвалюцыі XVII ст. і яе далейшае развіццё даюць важкія аргументы на карысць такога меркавання (паглыбленне і інтэнсіфікацыя яе стасункаў з практыкай, тэхнікай; наданне прыярытэтнага статусу пытанню «як?» перад пытаннем «чаму?»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«механізацыя» карціны прыроды і г. д.). Тым не менш яно з’яўляецца аднабаковым, бо тэза, згодна з якой высокае духоўнае вымярэнне навуковага пошуку ўмацоўваецца і робіцца ўсё больш уплывовым, таксама не з’яўляецца беспадстаўнай і недастаткова абгрунтаванай. Пра яе рацыю яскрава сведчыць, напрыклад, той факт, што фізічная касмалогія здолела ў XX ст. атрымаць істотныя перавагі ў плане грамадскай увагі і культурнага ўплыву перад філасофскай яе версіяй [4, с. 1154]. Касмалагічныя канструкцыі заўжды мелі грунтоўнае светапоглядное значэнне і таму – высокі каштоўнасны статус у культуры. На іх узроўні дасягаецца высокая ступень трансцэндавання эмпірычнага матэрыялу, навука істотным чынам набліжаецца тут да філасофіі.

Касмалагічныя тэарэтычныя пабудовы абапіраюцца, аднак, на «зямную» фізіку. Поспехі сучаснай навуковай касмалогіі выступаюць, такім чынам, як сведчанне высокага пазнавальнага (а таму і духоўнага) патэнцыялу тых фізічных тэорый (найперш, натуральна, усеагульнай тэорыі адноснасці), якія ўтвараюць яе падмурак. Духоўная вышыня навукі і няўхільнае ўзмацненне яе культурнага ўплыву засведчана, аднак, не толькі дасягненнямі матэматычнай фізікі і вынікамі касмалагічных даследаванняў: у галіне біялогіі сітуацыя мае ідэнтычны характар. (Магчыма, сучасная біялогія выяўляе ў гэтым плане нават больш важнае значэнне, чым фізіка, – праз сваё непасрэднае дачыненне да пытання пра існасць чалавека і яго месца ў Сусвеце [5, с. 11].)

Грунтоўны пазнавальны патэнцыял навуковага пазнання, які ўзмацняецца ў працэсе яго развіцця, ні ў якім разе не з’яўляецца, аднак, дастатковым для таго, каб прыпісаць яму вырашальную ролю ў духоўным жыцці чалавека і чалавецтва, у пошуках адказаў на вечныя і апошнія пытанні, якія заўжды належалі да праблемнага абсягу філасофскага мыслення. Падобная спроба робіцца, напрыклад, С. Хокінгам і Л. Млодзінавым, на думку якіх, сучасная навука ў стане сцвердзіць сваё вяршэнства ў сферы найвышэйшых чалавечых патрэбаў і памкненняў, кінуўшы смелы выклік і філасофіі, і рэлігіі, якім традыцыйна надавалася цэнтральнае светапоглядное значэнне [2, с. 11]. Такога кшталту прэтэнзіі навуковага пазнання сутыкаюцца з моцнымі контраргументамі (у дадзенай сувязі можна прыгадаць, напрыклад, палемічныя развагі Г.-Г. Гадамера, скіраваныя супраць тэзы пра ўнівесальны характар прыродазнаўчай карціны свету [1, с. 456]). Не надта прымальнай з’яўляецца і «спаборная» мадэль стасункаў навукі з іншымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сегментамі культуры, якая прапаноўваецца пры гэтым – значна больш плённай і дзейснай падаецца дыялагічная форма арганізацыі адпаведных дачыненняў.

На самай справе, няма ніякай неабходнасці прыпісваць навуцы дзеля яе магутнага пазнавальнага патэнцыялу неадпаведныя яе існасці функцыі ці разглядаць яе як непаўнавартасную духоўную форму з няпэўным культурным статусам і рангам дзеля ўласцівага ёй прагматычнага складніка. Калі ў сучасных умовах дачыненні высокадухоўнага і прагматычнага яе аспектаў у шмат якіх выпадках далёкае ад таго, каб быць гарманічным, дык гэта павінна зрабіцца стымулам для магутных намаганняў чалавецтва, скіраваных на іх гарманізацыю, якая можа быць дасягнута толькі шляхам паслядоўнай і няўхільнай гумманізацыі ўсіх бакоў ягонага жыцця.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

1. *Gadamer, H-G.* Hermeneutik: Wahrheit und Methode / H.-G. Gadamer // Gesammelte Werke. – Tübingen : J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – Bd. 1: Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 s.

2. *Hawking, S. W.* Der große Entwurf: Eine neue Erklärung des Universums / S. W. Hawking, L. Mlodinow. – Reinbek : Rowohlt, 2010. – 192 s.

3. *Kuhn, T. S.* The Structure of Scientific Revolutions / T. S. Kuhn. – 2-nd ed. – Chicago ; London : The University of Chicago Press, 1970. – XII, 210 p.

4. *Mittelstrass, J.* Kosmologie / J.Mittelstrass // Historisches Wörterbuch der Philosophie:in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971–2007. – B. 4. – S. 1153–1154.

5. *Monod, J.* Le hasard et la nécessité: essai sur la philosophie naturelle de la biologie moderne / J. Monod. – Paris : Seuil, 1970. – 213 p.